# ГРАМАДА ЯК КУЛЬТУРНАЯ АДЗІНКА І АСНОЎНЫ СКЛАДНІК ГРАМАДСКАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

# THE PEASANT COMMUNE (GRAMADA) AS A CULTURAL UNIT AND THE MAIN COMPONENT OF THE SOCIAL LIFE OF BELARUSIAN PEASANTS IN THE SECOND HALF OF THE XIX - EARLY XX CENTURY

Карбалевіч Наталля Мікалаеўна,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: сялянская абшчына, грамада, культурная адзінка, грамадскае жыццё

Резюме. Статья посвящена рассмотрению белорусской крестьянской общины как культурной единицы традиционного общества. Принадлежность к сообществу крестьян во второй половине XIX – начале XX веков являлась важнейшей составляющей жизни крестьянина. Отмечен ценностный характер народного восприятия крестьянской общины (грамады) как коллективного субъекта действия. Грамада представляла собой прежде всего сложную систему социокультурной коммуникации и важную форму социальной культуры белорусов.

Keywords: peasant commune, gramada, cultural unit, social life

Summary. The article is devoted to the consideration of the Belarusian peasant community as a cultural unit of a traditional society. Belonging to the community of peasants in the second half of the 19th - early 20th centuries was the most important component of the life of a peasant. The value of the popular perception of the peasant community (gramada) as a collective subject of action is noted. Hramada was, first of all, a complex system of sociocultural communication and an important form of social culture of Belarusians.

Вывучэнне гісторыі і культуры беларускай нацыі немагчыма без даследавання сялянскай культуры. У сваю чаргу немагчыма зразумець сутнасць традыцыйнай сялянскай культуры беларусаў без вывучэння сялянскай абшчыны. Разуменне традыцыйнай сацыяльнай культуры беларусаў немагчымае без вывучэння камунікатыўнага досведу грамады. Паняцці “сялянская абшчына” і “грамада” ў дадзеным тэксце будуць выкарыстоўвацца як сінонімы, бо дзеля таго, каб прыйсці да канвенцыянальнай дамоўленасці наконт напаўнення канкрэтнага тэрміна ў навуковым асяродку, неабходна спачатку вызначыць сутнасныя рэчы. У айчыннай гістарыяграфіі, найперш гістарычнай, замацаванае ўяўленне аб дваістым характары сялянскай абшчыны – як формы землекарыстання і як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі самакіравання сялян, значна больш рэдка ўзгадваецца культурны складнік сялянскай абшчыны. Між тым менавіта ён з’яўляецца асноўным. Грамада беларускіх сялян найперш уяўляла сабой унікальную культурную адзінку, якая характарызуецца ў тым ліку і складанай сістэмай грамадскіх узаемадносінаў са спецыфічнымі формамі грамадскага ўзаемадзеяння, механізмамі рэгуляцыі адносінаў паміж людзьмі, адметнай сацыяльнай рэальнасцю беларускай вёскі і інш.

Безумоўна, трэба ўлічваць лакальную варыятыўнасць культуры вясковых грамадаў і таму больш правільна сцвярджаць, што грамада беларусаў – гэта сукупнасць лакальных культурных адзінак. Але вызначаюцца і культурныя ўніверсаліі ў культуры беларускіх сялянскіх абшчын. Так, можна вызначыць заканамернасці ў распаўсюджаных амаль па ўсёй тэрыторыі Беларусі талацэ, вячорках і ігрышчах, характэрных рысах суседскіх узаемаданосінаў сялян, ролі

грамады ў сацыялізацыі асобы, нормах паводзінаў і санкцыях за іх парушэнне і інш. Такім чынам, можна сцвярджаць што грамада, ці іншымі словамі, сялянская абшчына беларускіх сялянаў у культурным сэнсе ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя існавала паўсюдна сярод беларускіх сялянаў. Асаблівасці сацыяльнай культуры, якія вызначаюць характар грамадскіх узаемаадносінаў і акрэсліваюць вызначальную ролю грамады ў іх, праяўляюцца ва ўсёй сукупнасці крыніц без залежнасці ад іх рэгіянальнага паходжання.

Каштоўнасная афарбоўка калектыўнага ладу грамадскага жыцця адлюстравана ў фальклоры, занатаваным па ўсіх рэгіёнах Беларусі. Можна лічыць, што ідэя калектыўнасці і ўзаемазалежнасці сялянскага ладу жыцця, трывала замацаваная ў беларускім фальклоры, з’яўляецца ў пэўным сэнсе яго інварыянтам. Напрыклад: “Грамада – вялікі чалавек” [1, с. 597], [2, s. 114], “Сидишь у ряду, тегни беду” [3, с. 248], “Один, да не людин” [4, с. 305], “С краю - в божом раю, а в серодке – у божой бородке” [4, с. 309], “Што будзя міру, тоя й бабінаму сыну” [5, с. 95], [1, с. 533], [6, s. 59], “Адзін з’еш хаць вала, то ўсё адна хвала” [1, с. 578], [2, s. 6], “Хто жыве ў купі, таго ні баліць ў пупі” [2, s. 157], [7, с. 176], “З міру па нітцы, то голаму рубашка” [2, s. 188], Ф. Сурын адзначаў, што гэтая прыказка – “З міру па нітцэ, беднаму сарочка” [6, s. 59] – падкрэслівае разуменне велізарнай ролі аб’яднання, супольнага ладу жыцця беларускімі сялянамі. Неабходна падкрэсліць, што адсутнасць абшчыннага землекарыстання і імкненне сялян да індывідуальнага землекарыстання не з’яляецца вызначальным фактарам існавання сялянскай абшчыны як формы грамадскай культуры. Напрыклад, зафіксаваная Адам Варлыгам схільнасць сялян да індывідуальнага гаспадарання на зямлі ў фальклоры Лагойшчыны адначасова спалучаецца з кампліментарным матывам і ў дачыненні да вясковага асяродку: “У сяле, як у сіле; на адзіноця, як у злоця” [5, с. 86].

У народных уяўленнях грамада, ці іншымі словамі супольнасць людзей, грамадскі асяродак, выступала як актыўны калектыўны суб’ект дзеяння, з якім лічыліся, да якога апелявалі ў спрэчных сітуацыях, якому нават спрабавалі супрацьстаяць: “Не бойся, девчиночка, худыя славы, / Ходем, повенчаймось, будом жить у пары. / Нас не разлучать ни поп, ни громада, / Ни поп, ни громада, ни лихие люди” [3, с. 126], “И Бог и люди отступилися” [4, с. 297], “Не итти ведь против мира! Вы уже знаете, что без мира – “рады” нет, а как мир “установы заведеть”, так другому, хоть бы и хотел, некуда выскочить” [8, с. 185], “Стоить явор, стоить зелененьки, / Ой выхав из села рекрут молоденьки; / Шапку изнявши, / Да и поклонивса: / Выбочайте, вся громада, / Мо, с кім посваривса, / Покрепляйте дороженьку, / Щоб нэ курылася, / Развважайте отца, матку, / Щоб по мні нэ журыласа” [7, с. 136]. Грамада выступала як сацыяльны камертон і характарызавалася адзінай сістэмай інфармацыі.

Сялянская абшчына з’яўлялася зычыненай сацыяльнай суполкай, а ў стасунках са знешнім светам вялікае значэнне мела супрацьстаянне “свой – чужы” [9, с. 271]. І.А. Сербаў адзначаў і сацыяльную зачыненасць вічынскіх палянаў: “Падыйсьці да іх, унікнуць у іхняе асяродзьдзе вельмі цяжка. У кожным чужым чалавеку яны звычайна схільны бачыць свайго злосьніка, нават ворага. Гэткія асобы, як поп альбо настаўнік, якія жывуць з імі па некалькі гадоў і нават сябруюць, – усё-ж такі ў канцы-канцоў застаюцца для іх чужымі” [10, с. 55]. У матэрыялах М. Федароўскага таксама адзначаецца сялянскае ўяўленне аб тым, што “чужога чалавека лепш здалёк абысці” [2, s. 62].

Каштоўнасць сваёй сацыяльнай сістэмы для сялянаў выразна праяўляецца ў крыніцах у аспекце сватання жаніха да нявесты. Мясцовасць, тутэйшасць выяўляецца як аксіялагічна, каштоўнасна афарбаваны паказальнік і як аргумент у спрэчцы. Так, так сват звяртаўся да няветлівай і неласкавай гаспадыні хаты: "Да ты, Ивановна, не гневи Бога. Што мы не тутошніи? Ти мы Бог ведаить откуль? Ти наш Пилип хуже людей? Ти ты нашего швагру-небощика не знала?.. Гэта-ш завсегда так на людях бываить… Ваш товар, наш купец!" [8, с. 168].

Адпаведна сяляне імкнуліся па магчымасці жаніць сваіх дзяцей у сваёй вёсцы, не аддаваць дзяўчат-нявест далёка ад дому: "Под тым коником мой братка лежиць, / Над им сестрица родная стоиць. / Ци я не казала, да мой браточка: / Не бери жены с чужой стороны, / Ой возми жену у своём селе, / У своём селе хоць суседочку, / Хоць суседочку сироциночку" *[11, с. 93]*, "Пойдзешь дзевочка, ў чужіе людзи, – / Там вулочки нивядомыя, / Молода блудзиць будзеш, / Там суседочки незнаёмыя, / Об цябе судзиць будуць, / Ни так суседочки, як суседныя дзетки" // "– Я там вулочка поразведаю, / – Блудзиць ня буду, / – А с суседками разпознаюся, / – Судзици ня будуць" [12*, с. 187]*. Як адзначаецца ў матэрыялах П.В. Шэйна, ужо іншая вёска, якая знаходзілася ў некалькіх вёрстах, называлася непрывабнай "чужой стороной", пра якую спявалі: "Чужая сторона без ветру шишиць, / Чужы татулька, чужая матулька / Без вины журиць" [13*, с. 190]*. Гэта вынікала і з разумення каштоўнасці свайго асяродку з пункту гледжання знаёмасці, камфортнасці грамадскай сістэмы ўзаемаадносінаў. Так, дзяўчына, якая выйшла замуж у іншую грамаду, спявала: "Отдав мене батюшка на чужую сторону, на чужую далекую, где люди не гожи. / В хати сметьтя по колены, на столе рогожи, а мне молоде – молодёшаньцы глядеть непригожа. / Хожу блужу да по вулицы, ик белая овца, не с ким стати размовляти мне вернаго словца. / Хожу блужу по вулицы ик серая вутка, отбилася от родоньку – не прибъюся хутко" [4, с. 5]. Гэты матыў можна лічыць універсальным, у фальклоры ён характэрны не толькі для маладых дзяўчат, але для любога, хто развітваўся са сваім асяродкам. У фальклоры падкрэсліваецца непажаданасць змены месца жыхарства, ў сваім традыцыйным асяродку забяспечаны сацыяльны камфорт.

Міжвясковае супрацьстаянне адлюстроўваецца і ў наступных павер'ях, якія выяўляюць чужы асяродак як невядомы і небяспечны. Напрыклад, калі селянін выпраўляўся ў дарогу, ён ведаў, што "калі каняка пырхае яшчэ на месцы ці на дарозе, покуль яшчэ своя зямля, та ў дарозі пашчасціцца, а калі за ваколіцаю, дзе чужая зямля, та будзе прыгода або які-небудзь прыпадак" [14, с. 113].

Э. Яленская таксама прыводзіла прыклад узаемадачыненняў вёсак на Палессі. Так, жыхары дзвюх суседніх вёсак у гэтым рэгіёне мелі напружаныя адносіны паміж сабой, рэдка ўтваралі шлюбныя пары, калі даводзілася сустрэць жыхароў іншай вёскі, сяляне ўпарта трымаліся сваім гуртам аднавяскоўцаў і дэманстравалі ўзаемную непрыхільнасць да сялянаў суседняй вёскі, якая часта праяўлялася ў жартах і кпінах [15, s. 5]. Як бачна, сацыяльная рэальнасць вёскі-грамады магла ўяўляць сабой замкнёнтую прастору, за межамі якой існаваў чужы, невядомы свет.

Характар узаемаадносінаў у грамадзе і ўвесь лад сялянскага жыцця дазваляе меркаваць, што сялянская абшчына беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзяў з'яўлялася культурнай адзінкай са складанай структурай і сукупнасцю разнастайных функцый, а не проста сукупнасцю эканамічных і адміністрацыйна-арганізацыйных абавязкаў і прынцыпаў землеўладання. Зачынены, ізаляваны характар існавання сялянскай абшчыны ўтвараў унікальную супольнасць людзей са

спецыфічным ладам жыцця, інтэнсіўнымі грамадскімі адносінамі ва ўсіх сферах, якія характарызаваліся аргнанічнасцю, салідарнасцю. Як трапна адзначыў Я.В. Часноў, людзі ў сялянскай абшчыне аб'яднаныя "траекторыяй іх агульнага лёсу" [16, с. 143].

Такім чынам, можна казаць пра трыадзінства сялянскай абшчыны ў беларускай гісторыі, якое ўтвараецца праз вызначэнне яе як формы землекарыстання, як адіністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі самакіравання сялян і як культурнай адзінкі. На падставе вывучэння корпуса крыніц можна зрабіць выснову аб тым, што грамадскае жыццё беларускай вёскі ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя адбывалася ў межах вясковай грамады, і культурны складнік быў вызначальным. Сялянская абшчына з'яўлялася складанай грамадскай сістэмай, у аснове якой знаходзіліся разнастайнага кшталту сувязі: сацыяльныя, прававыя, гаспадарчыя, эканамічныя і інш., і паслабленне адных з іх не прыводіла да знішчэння абшчыны. Менавіта ў абшчыне адбывалася ўсё асноўнае грамадскае і духоўнае жыццё селяніна, яго фарміраванне як асобы. Будучыня навуковага даследавання дадзенай тэмы бачыцца як у вывучэнні сутнасных, так і нівеляванні ацэначных адрозненняў пры вызначэнні сялянскай абшчыны, а таксама ў здольнасці даследчыкаў глядзець на сялянскую абшчыну сістэмна і ўсебакова. Традыцыйная сацыяльная культура беларускіх сялян – гэта найперш культура грамадскіх узаемаадносінаў у межах калектыву грамады. Грамада беларускіх сялян грунтавалася на сістэме спецыфічных, дэталізаваных, унармаваных узаемаадносінаў сялянаў, якія былі замацаваныя традыцыяй. Грамада беларусаў ёсць форма сялянскай абшчыны ў шырокім культурным сэнсе.

Літаратура

1. Пяткевіч, Ч.Г. Рэчыцкае Палессе / Ч.Г. Пяткевіч; уклад.; прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2004. – 672 с.

2. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905: w 8 t. / M. Federowski. – Kraków,Warszawa, 1902 – 1981. – T. 4: Przysłowia, żarciki, wyrażenia stałe oraz zagadki ludu, mieszczan i zagrodowców z okolic Grodna, Sokółki, Białegostoku, Bielska, Wołkowyska, Słonima, Nowogródka, Słucka, Lidy, Wilejki, Swięcian i Oszmiany. – Warszawa: Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1935. – XVIII, 490 s.

3. Радченко, З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские) / З. Радченко. – Санкт-Петербург: Типография В. Безобразова и Комп., 1888. – II, XLIII, 265, III с.

4. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Киев: типография С.В. Кульженко, 1885. – Вып. 1 – 2: Песни, пословицы, загадки. – XI, 468, [4] с.

5. Варлыга, А. Прыказкі Лагойшчыны / А. Варлыга. – Нью-Ёрк, Мюнхен: Выданне фундацыі ім. Пётры Крэчэўскага, 1966. – 112 с.

6. Suryn, F. Słów kilka o tworach fantazyi ludu na Białejrusi / F. Suryn // Tygodnik Illustrowany. – 1873. – T. 11. – № 266. – S. 58 – 59.

7. Булгаковский, Д.Г. Пинчуки. Этнографический сборник. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь / Д.Г. Булгаковский. – Санкт-Петербург: Тип. В. Безобразова и Комп., 1890. – VI, 200 с.

8. Пщелка, А.Р. Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А.Р. Пщелко. – Изд. 2-е, вновь пересмотренное и исправленное автором. – Вильна: Типография “Русский почин”, 1906. – [3], 248 с.

9. Чаквин, И.В. Избранное: теоретические и историографические статьи по этногенезу, этническим и этнокультурным процессам, конфессиональной истории белорусов / И.В. Чаквин; отв. ред.-сост. А.Вл. Гурко; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исследований белорусской культуры, языка и лит. – Минск: Беларуская навука, 2014. – 463, [16] с.: ил.

10. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне: матэрыял. культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І.А. Сербаў; прадм. Т.А. Навагродскі, Я.А. Пясоцкая. – Мінск: Беларускі Фонд Культуры, 2005. – 88 с.

11. Янчук, Н.А. По Минской губернии: заметки из поездки в 1886 году / Н.А. Янчук. – Москва: Типография А. Левенсон и К, 1889. – 29 с., 130 с., 5 л. нот.

12. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Санкт-Петербург: Типография Императорской Академии наук, 1890. – Т. I. Ч. II.: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – XXXI, 708 с.

13. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1902. – Том III.: Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, северья, приметы и т.д. – IV, 535 с.

14. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў /А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. А.С. Фядосік; прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

15. Jeleńska, E. Wieś Komarowicze w powiecie mozyrskim / E. Jeleńska. – Warszawa: Józef Jeżyński, 1892 – 83 s.

16. Чеснов, Я.В. Лекции по исторической этнологии: Учебное пособие / Я.В. Чеснов. – Москва: Гардарика, 1998. – 400 с.